БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Рэдакцыі Ново-Серпухускан 28
Адміністрацыі Захароускан
«Юбілейны Дом».

…кцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
…ністрацыя—рана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

…кцыя пакідае за сабой права па…ляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рубл.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран 1 руб.
на апошняй—50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 86. Менск. Серада 10 ліпня 1918 г. Год I

АБВЕСТКІ.

Усе рэзьнікі павінны у мейсцох прадажы павесіць вы…і з нямецкімі і расійскім напіс. Кожны рэзьнік па…н заявіць № сваей крамы купляючы мясо у гарадзкой …і.

Вывескі трэбг адтрымаць да серады 10 ліпня на бойні

Менск, 9 ліпня 1918.

Нямецкі Градоначальнік.

Усе рэстараны і сталоукі, якія атрымліваюць прадукты …харчавога аддзелу Граданачальства, павінны ваяуляць …атрэбаванні па ауторкам ад 10—12 ч. у дзень, у другія запатрэбаванні прыймацца ні будуць.

З запатрэбаваннямі на цукер трэба, як і дагэтуль, …ртацца у харчавы камітэт, а ні у граданачальство.

Менск, 9 ліпня 1918 г.

Нямецкі Градоначальнік

Будоуніцкі аддзел Менскай Меськай Управы, з мэт пад…і пацярпеушаму ад вайны насяленню, распрадае улась…ам майстэр. яу, хвабрык, заводау, каапэратывау і іншым …рэбіцелям для уласных патрэб **розны жалезны і будоу…ні матэрыял.**

На рэч пакупкі павінна быць падана у Будоуніцкі Ад…л Управы пісьменая заява с паказаннем прапанованай …ны за купляемае і дзеля якой патрэбнасьці гэта самае …яецца. Прыем заявау што дня ад 12 да 3 гадзіны у …энь.

Агляд рэчэй на прадажу на складзе пры Управе на …раускай вуліцы і на складзе пры парку конна жалезнай …рогі.

Член Управы
Інжэнэр **Э. Цывінскі.**
Загадч. скл. **С. А. Усьціновіч.**

№ 1690/7880.

Менск 10.VII.

Атэстат сьпеласьці.

Беларуская Рада, выбраная …сбеларускім конгрэсам, цяпер …бы патрыярх паміж усімі …цыянальнымі Радамі бывшаў …сіі.

Украінская, каукаскай, эс…нская, латыніская і усе другія …з выключэнни якіх былі, кон…алі свой кароткі век. Адна …ларуская перажыла усіх сва…х таварышоу. Во яна зауслг…ы стала на дзержауным …унке нагляду; каханне да …ларусі і нацыянальныя інтэ…эсы сталі вышэй партыйных …ограм. У апасную мінуту …се варожыя між сабой партыі …ады рабілі адзін дружны бе…рускі фронт. Мудрасьць бе…ларускаго народу адбіваецца і …яго прадстаунiцтве—Радзе.

Можа Рада іщчэ і слабая і …азыцыя яе палітычна-міжна…одная ні цьвердая, але яна …ожа сьмела глядзець у вочы …беларускаму народу. Яна су…верэнітэт народу беларускаго …анесла і ахраніла да сягод…няшняго дня, і перадасьць да…ерсе народа Заканадаучай Радзе у восені.

Калі Беларусь і яе Рада іщчэ ні выйгралі, то за тое яны іщчэ ні праіграли і ні нагубілі народных правоу.

У ліпні будзе 1 год жыцця, юбілей нацыянальнаго беларускаго цэнтру. У ліпні быу выбраны нацыянальны камітэт, і прыемственнасьць нерадавалася з рук у рукі, ад нацыянальнаго камітэту Вялікай беларускай радзе, потым усебеларускаму конгрэсу, а насьля Радзе Беларускай Рэчы паспалітай.

Першая сэсія Рады закончыцца, яна павінна вярнуць суверэнітэт народу, каб ен выбрау Заканадаучую Раду.

Паслы Рады першай сэсіі былі першымі каваліямі нацыянальнай еднасьці і прабуджэння. Яны зрабілі вялікую працу паміж беларусамі-салдатамі, на вёсках, мястэчках, местах, школах. Іх разганялі і арыштовывалі большэвікі. Але нацыянальную працу яны ні спынялі ні на адну сэкунду. Яны ж абаранілі і заваевалі нашу беларускую сталіцу Менск адпагромау большэвіцкаго адступлення. Беларускія дружыны у Вітэбску сталі на ахрану яго калі большэвікі маніліся адступаць. Пачуцце нацыянальнай самаахраны і еднасьці у беларусау вытрымала усе экзамены, і можа ужо гісторыя выдаць нам атэстат грамадзянскай сьпеласьці.

* * *

Габінэт Р. Скірмунта.

Новаму габінэту даюцца цяжкія заданні. Уцьвярдзіць міжнароднае становішчо Беларускай Дзержавы, злучыць у у адно цэлае цяпчасную нашу Бацькаушчыну збурэнную вайной і парваную на 4 часьці.

Трэба падняць аўторытэтнасьць беларускаго міністэрства, сабраць усе жывыя сілы ні тольві беларусоу, але усіх грамадзян нашай зямлі, каб зрабіць мудрае устройство і арганізаваць красвую гаспадарку каб формы жыцця памагалі высокаму росквіту культуры усяго краю і беларускай нацыянальнай ідэі. Трэба прыгатаваць с помоччу спэцыялістау праэкты усіх законау, і глаунаго—зямельнай рэальнай эуропэйскай рэформы.

Усе беларусы будуць шчыра дапамагаюць новаму габінэту у яго адпаведнай працы.

Агульныя весткі.

ШТОКГОЛЬМ. Аб марскім лётчыку капітане Крокштэдт, паднятышымся разам з баронам Цэбэрстрэмам, дзеля палету праз Аалтыйскае морона апарацэ, зробленым у швэдскай авіацыйнай майстэрні, ужо некалькі дзён німа ніякіх вестак, Аддзельныя часьці самалёту знойдзены каля Аляндскіх Выспаў. Дзеля гэтаго можна быць пэўным, што абодва лятуны пацярпелі катастрофу. Цэдэрстрэм быў першым лятуном Швэцыі, Крокштэдт—самым выдаючымся марскім лятуном.

МАСКВА 7 гм. «Вольф». Фракцыя левых соцыялістаў-рэволюцыянэраў прызналася у участцы у забіўстве нямецкаго пасла гр. Мірбаха.

Іх прадстаўнікі, зачыненыя у тэатры былі арыштованы. У розных пунктах горада пачаліся спатычкі контр-рэвалюцыянэраў, проці большэвікоў. Да гэтаго часу перавага здаецца на старане большэвікоў.

«Dz. Minski».

ЖЭНЭВА. Дэлегаты хаўрусніцкай канфэрэнцыі у Лёндані аднагалосна прынялі рэшэнне у карысьць будоўлі тунэля пад Ламаншскім каналам. Газэта «Дэйлі Кронікль», даўшая гэтую вестку, выказываецца за прыступленне да работы зпраз-жа.

Весткі з Расіі.

Сыбір. У той час, як Рэйтэр паведамляе з Іркуцку, што чэхо-славакі разбілі большэвікоу к захаду ад Іркуцку і выгналі іх з Ніжне-Удзінску, Тулуна, да усходу ад Байкальскаго возера і што большэвікі пакідаюць Іркуцк, «Вінэр Тагблат» паведамляець аб усе болей крытычным становішчы чэха-славакау у Сыбіры Яны ужо пацярпелі некалькі вельмі сурьезных неудачау У баях проціу чэха-славакоу асобна актыуна выступілі аустро-венгэрскія ваенна-палонныя, арганізаваушыя самаістныя формацыі з мэтай самаабароны. «Локаль анцэйгер» прыводзіць паведамленне з Швэйцарыі, што Гэрманія патрэбавала ні тольві разброення, але так-сама і выдачы чэха-славацкіх войск. Большэвіцкі урад прынау гэто вымаганне

БЭРЛІН, 6/VII. Як паведамляе нямецкая газэта «Норддэйчэ Альгеймэйнэ Цэйтунг», вось якія прамысловыя прэдпрыяцці «нацыяналізаваны» дзержавай. Вугальныя копі, жалезныя, медныя, плятынавыя, сярэбраныя, алавяныя, цынкавыя, азбэставыя і соляныя руднікі, машынныя хвабрыкі і тэхнічныя майстэрні, ткацкія і элёктро-хімічныя прэдпрыяцці, лясапілкі і іншыя хвабрыкі абрабляючыя дрэво, табачныя хвабрыкі, шкляныя і керамічныя заводы, млыны, скураныя і цэмэнтовыя заводы, газовыя заводы, трамваі, каналізацыі і прыватныя жалезныя дарогі і нарэшці ўсе другія вялікія і сярэднія хвабрыкі і прэдпрыяцці, маючыя значэнне для дзержавы. Адначасова народны камісар па таргоўлі і прамысловасьці напамінае аб цыркуляры, што уся жалезная таргоўля монополізавана.

БЭРЛІН, 6/VII. Кіеуская еурэйская народная газэта паведамляе, што место Баку акружаны горцэмі, і што армяне звярнуліся да гэрманскіх уласьцей с прозьбамі а помачы і заняцці места.

Пажар у Адэсі. На хвабрыцы самалётаў быў пажар, пры чым агнём знішчано шмат апаратаў.

Сучасная вайна і адраджэнне пад'ярэмных Народау у Расіі.

Ужо некалькі дзесяткаў гадоў як пад'ярэмныя народы Расіі пачалі змагацца з асіміляцыяй і сьвядома выяўляць сваё нацыянальнае «я», сваю самабытнасьць.

У гэтым кірунку ім сыстэматычна перашкаджалі з двух старон: крайне правыя (імпэрыялісты) і крайне левыя [інтэрнацыяналісты).

— Моц дзержавы істнуе у цесным і гвалтоўна дысцыплірованным злучэнні ўсіх народнасьцяў, паселяючых імпэрыю. Дзеля гэтаго трэба як найболей звузіць рамкі іх асобістых праяў, у якой бы сабе ні было прадуктыўнасьці,—як культурнай, так-сама і экапамічнай. Усё павінна выходзіць с-пад агульна імпэрскай маркі.

Гэтак гаварылі імпэрыялісты.

— Чым меней будзе лік народаў на зямлі, тым бліжэй будзем стаяць да усесьветнаго соцыялізму і гэтым самым надбліжыцца да жыцця ідэя інтэрнацыяналізму, жыццёвы добрабыт усіх народаў.

Гэтак гаварылі соцыялісты-інтэрнацыяналісты.

Вось на гэтым пункці крайне праціўныя у поглядах партыі дзіўна сходзіліся і сходзяцца, разам шкодзючы у праціяг некалькі дзесяткаў гадоў, якой бы сабе ні было, рвучэйся выяўляць у розных формах сваю індывідуальнасьць нацыі.

Гэтыя пад'ярэмныя нацыі у Расіі дзелюцца на славянскія (як украінцы, беларусы, палякі), дзе культуры з пануючай вялікарускай нацыі блізкія і часам нават перамешаныя, і неславянскія (каўказскія народы, крымскія, сыбірскія, Фінляндзія, Ліфляндзія, жыды, літвіны і інш.), дзе мовы, культуры і гістарычныя традыцыі вельмі рожнюцца.

Дзякуючы розным простым (як забароненне школ, друку і г. д.) і пабочным (як розныя эканамічныя забароны і рэпрэсіі, ніпрыняцце у розныя джержаўныя установы і др.—тэндэнцыі «да нірускіх») націскам, ад асыміляцыі пацярпелі усе народнасьці Расіі.

Большы працэнт, разумеіцца, у гэтым кірунку падае на вялікарускіх «сваякоў», як Беларусь, Украіну і Польшчу, да каторых расійскі урад с тэндэнцыі «крэўнасьці» заўсёды аднасіўся болей строга, як да другіх нацый, дзеля найхутчэйшаго зьліяння «въ русскомъ морѣ».

Разумеіцца, што гэтыя жыццёвыя варункі над такім сыстэматычным напорам расійскаго празмеру стараннаго патрыятызму мелі свой уплыў на вышэй памянёныя нацыі.

У кожнай вытварыліся дзьве партыі «за» і «проціў» расійскай асіміляцыі. Партыі гэтыя вялі пастаянную барацьбу паміж сабою. Нацыяналісты называлі асымілятароў здрайцамі свайго народу, рабамі чужой волі. Асымілятары называлі нацыяналістаў адсталымі ад агульна чалавеччых сацыяльных ідэй, шовіністамі.

Але жыццёвая праўда была за лепшымі прэдстаўнікамі кожнай с такіх нацый, у каторых нацыяналізм быў ні шовіністычна-чорпасецонны, але ідэёвы, дзе выяўленне індывідуальнасьці і асобнасьці кожнай нацыі лічылося адным з найпатрэбнейшых здабыткаў агульнаго чалавецтва, які ні толькі ні шкодзіць але—наадварот—памагае сацыяльным ідэям усяго сьвету.

Гэта самая чыстая нацыянальная ідэя ярка і значна выбухла за час цяперашнай вялікай вайны.

Сучасная вайна зпаменуе сабою іменна адраджэнне пад'ярэмных малых народнасьцей. Воляй льосу выйшло так, што гэтая вайна шмат ім памагла у напрамку самаістнасьці.

Па усей быўшай Расійскай Імпэрыі мы бачым выступленні на арэну дзержаўнаго ніззалежнаго да Расіі жыцця кожнаго з вышэйпамянёных народаў.

Праўда пасьля, перавароту у Расіі сацыяльныя гуртоўшчыкі розных народаў пад ярлык ядзіннай вялікай махіны стараліся шкодзіць адраджэнцам галовы свае падняць. Начынаючы ад Керэнскаго і канчаючы большэвікамі, шмат крыві лілося дзеля гэтаго, але, жыцце ідзець сваім пуцём, і, наперакор розным тормазам, малыя народнасьці адбудовываюцца, праца у іх кіпіць, як пасьля пажару. Да пачатковай работы далучаюцца розныя палітычныя, эконамічныя і культурныя сілы і творыцца новае жыццё.

І вось адраджэнне народнасьцей Расіі—самыя лепшыя трафэі сучаснай вялікай вайны.

Я—р.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 8 ліпня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Артылерыйская дзеяльнасьць ажывілася у вечары. Яна прынімала часамі вялікую сілу у ночы на абодвух берагох рэкі Ліс каля канала Ла—Бассэ і на Сомме. Варожая дзеяльнасьць разведчыкаў. Сільныя варожыя націскі каля Мэррыс і паўднёвей р. Ліс акончыліся ніудачна.

Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.

Захадней Шато—Тьерры прадаўжаўся сільны агнёвы бой. Варожыя атакі па вучастках Кліньон і паўднёва-захадней Рэймса былі адбіты.

Летэнант Біллік меў сваю 22 перамогу у паветры.

Першы Гэнэрал-кватэрмэйстар **Людэндорф**.

Маленькі фэльетон.

Старыя сельскія совдепы у Расіі дэкрэтам Леніна заменяюцца з новым беззямельных селян.

(З газэт).

«Мы, Вялікі Ленін I і 2 Ульянаў,
Мы, Ільля ніпарушымы, гэтман партызанаў,
Кунгс латышскіх кондотьераў і матроскіх банд,
Страх на правых усіх эс-эраў, большэвіцкі гранд;
Мы, «всея»... Масквы «владыка», ў совнаркоме Першы,
Аб'яўляем Нашу волю і жывым і ўмершым:
Наш парадак палітычны,—кажэ так рабіць
Час цяпер каммуністычны, трэба ўсё дзяліць.
І аднак, хоць гэта прыкра, мусім Мы прызнаць
Саботажнікаў Нам цяжка усіх перамагаць.
Хто ні знае што ў Расіі аж залішне грунтаў,
Што селяне ўсе павінны ўзбагацець ад бунтаў,
А глядзіце—беззямельных скрозь па вёсках цьма.
Як жа так што ёсьць зямліца і, ізноў, німа?
Ні іначэй што кадэты і зямлю падбілі,
Скараціцца ёй, зьменьшыцца хітра ўгаварылі.
Тут віна старых совдепаў, трэба іх зьмяніць,
Вот прыклад Наш: беззямельных у Рады пасадзіць.
А для іх наказ найстрожшы: Як зямля з нас хлусіць
І ні хочэ Нам скарыцца, дык яе... прымусіць
Дзе загон знарок звузее,—трэба пакараць:
Расцягнуць яго у двое—тады будзе знаць!
За адпорнасьць, ніслухмянасьць батагоў даць дзесяць,
Калі ж гэта ні паможа,—асудзіць! павесіць!»

(«Декрет С. Н. К.» «Извѣстія» № 1234567890.)

сьпісаў **Сальвэсь.**

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Захват цэркваў. Консысторыя адтрымала афіцыяльныя весткі, што у мястэчках Своятычы і Стволовічы, Навагрудзкаго павету, каталікамі самачынна захоплены два праваслаўныя хорамы—і пераробленый у касьцелы.

Проціў полонізацыі. Сьв. Мікалаеўскае епархіяльнае брацтво мае пачаць болей актыўную працу проціў усе узмацовываючэйся, па яго весткам і данным, полоноізатарскай пропаганды. З гэтай мэтай сягоння, 10 ліпня, склікаецца агульны сход членаў брацтва.

У земстве. На 25-ае ліпня назначэно першае сабранне губэрнскаго земкамітэту па народнай асьвеце, прычым адным с першых заданняў камітэту будзе апрацоўка становішча а паветовых камітэтах па народнай асьвеце.

Падмога інвалідам. 7-м чарговым земскім сходам асігнавано 3,000 руб. на выдачу пасобій ваякам інвалідам дзеля абучэння рамеслам, сельскай гаспадарцы, коопэрацыі і г. д. Цяпер адтчынены прыем заяваў аб гэтых падмогах земскай управай.

Школьная сецьь. Паведлуг вестак губэрнскаго земства, у Менскай губэрні, сільна пацярпеўшай ад вайны, у некаторых паветах, як Бабуйскі напрыклад, калі з боку нямецкіх уласьцей будзе выказано згода на адчыненне усіх новых школ, намечаных павятовай управай, школьная сець 1918 г. будзе амаль зусім закончэна.

Маскоускія цэны. Прыехаўшыя з Масквы пасажыры перэдаюць аб казачных цэнах на рэчы першай патрэбнасьці хлеб—10 руб. фунт, цукер—22 р. ф., мясо—10 р. фунт.

Хлеб у праціяг першай паловы бягучаго тыдня, пачынаючы ад панядзелка, (на запасныя боны) выдаецца па $1^1/_4$ на порцыю, у праціяг другой паловы тыдня, пачынаючы ад чацьверга,—па 1 фунту на порцыю.

У месьнай управе пэнсія служачым за чэрвень, дзеля нідахвату грошай, заплачано часьцічна.

С пэнсыяй за ліпень будзе іншчэ болей цяжка, дзеля таго што налогавыя ад 1-го ліпн[я] за другое палугодзіе пасту[п]ленні у кассу запаздалі, прычын познай разсылкі аб[ы]ватэлям налоговых лістоў.

Месьскія працэнтныя абліга[]цыі на 2.500.000 руб. шэсь[]працэнтныя будуць выпушч[а]ны у хуткім часе.

Гэто—адна з найвялікшы[х] мерапрыяццяў магістрату дзе[]ля папраукі папсутых фінан[]савых спраў.

Пэнсіі. У афіцэрскае бюр[о] (Петрапаулоуская, 50) запра[]шаюцца з дакумэнтамі дзел[я] адтрымання пэнсіі адстаўны[я] афіцэры, ваенныя, чыноунікі[,] ваенныя лекары і члены і[х] сямействаў, адтрымаўшыя пэн[]сію с казначэйства, а так-са[]ма члены сямействаў такіх ж[е] чыноў прэбываючых у палоні[.]

Вольная Беларусь № 25 вы[]шоу 6-го ліпня. Зьмест №: Д[а] краевае інтэлігэнцыі, стацц[я] К. Шафнагэля; Нашы месты[,] гістарычныя нарысы Я. Л[.] Апаведанне без назвы, апаве[]данне Я. Л.; вершы, хроніка [і] інш. Цана асобнаго № – 30 [к.]

На рэках Вавілону.

(успамінкі уцекача)

XII*).

Клікала я прыяцеляў маіх,—
Яны ашукалі мяне.
(Плач Ерэміі, I 19).

Бачылі гэта нашы людзі і горка станавілася ў іх на душы, але усе жткі ні трацілі надзеі што «братскій» народ, апомніцца, але і гэта надзея скора рухнула. Надыйшла весна і пачаў ў жыцце праваздзіцца дэкрэт «зямля ўсім тым, хто на ей сам будзе працаваць». Нашы селяне перастрашаныя лгарскімі весткамі, якія носяцца па Расіі аб нямецкіх «зьдзеках» над нашым краем, думалі так сама скарыстаць з гэтаго дэкрэту і дастаўшы па куску зямлі пазаўсёды астацца у «братскай» Расіі. Толькі і тут чакаў іх вялікі смутак. Вясковыя соляне—расійцы—і слухаць ні хацелі, каб уцекачоў надзялілі зямлёй. Ды і гдзеж надзяліваць зямлёй нашых людзей, калі нават обшчаство, каторае «мело» многа маёнткаў ані пядзі ніуступало з іх суседняму, хоць тое «ні мело» нават і трох дзісяцін панскай зямлі, якой бы магло пашырыць свае паласы.

Гэтыя варункі застаўлялі нашых людзей ўсе свае думкі зьвертаць ў старану роднаго краю.

Нікому ні хацелося брацца за працу ці распачынаць які нібудзь інтэрас. Кожны чакаў толькі той гадзіны, каб як хутчэй паехаць дамоў і кожная вестачка з роднаго краю маланкай абегала нашых гаротнікаў. Тугу па родным краю ні маглі зглушыць фалшаваныя страхі аб тых «антыдэмократычных» парадках якія завялі немцы у нас. Кожны як мага пачаў зьбіраць грошы на дарогу і на тое каб пасьля там, ў родным краі, мець на адбудаванне сваей знішчанай гаспадаркі. Тыя, хто меў болі адвагі і троху грошы, пачалі рызыкаваць прабрацца дамоў і ўжо перад Вялікадням па поваму сгылю выехала цэлая партыя.

На іх усе глядзелі як па дзіво і прасілі пісаць як можна часьцей праве чуць ні с каждай станцыі. Нікаторыя з іх шчыра споўнілі гэту просьбу і скора пачалі прыходзіць весткі, каторыя і страшылі і разам падавалі надзею, што ўсеткі сяк-так заехаць у родную старонку можна. А ў гэтым як раз часе у камітэт помачы уцекачам адна за другой прыходзілі тэлеграмы каб уцекачам ні пазвалялі ехаць, с той прычыны, што ў Оршы, праз якую найбольш ехало уцекачоў, надта трудна дастаць ад нямецкаго ураду пазваленне праехаць і што з гэтай прычыны прыходзіцца чакаць часам нават па два тыдні. Слухі гэтыя скора пацьвярдзілі і лісты адтрыманныя з Воршы і Менску. Гэтым карысталі Расійскія большэвіцкія газэты і ўсё болі і болі пужалі нашых людзей. Нірааз пужалі нават тым, чаго тут цяпер ні бачу. Але праўду, відаць, кажуць, што міласьць да роднаго краю сільнейшая ад усяго, бо нічога ні магло паўстрымаць хвалі вертаўшыхся да хаты уцекачоў і яна дзень ада дня усе становілася шырэй і шырэй. Найбольш ехалі праз Воршу, Полацк і Дзьвінск, а той факт, што с тых хто паехаў ні варочаўся ніхто назад, дадаваў ахвоты іншым. З гэтай хваляй і я праз Полацк дабраўся дамоў.

В. Грыневіч.

*) Гл. №№ 73, 75, 78 84 і 85.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынбдята.